**Андрэй БУЧА**

# Беларускі навуковы кабінет у Празе (1927–1930 гг.): стварэнне і дзейнасць

*У 1920–1930-я гады сталіца Чэхаславацкай Рэспублікі Прага з'яўлялася інтэлектуальным, акадэмічным, навукова-даследчым цэнтрам беларускага замежжа. У гэтай краіне вучыліся сотні беларускіх студэнтаў, жылі і працавалі беларускія грамадскія дзеячы. Адной з цікавых старонак гісторыі беларускай эміграцыі ў Празе ў міжваенны перыяд з'яўляецца дзейнасць Беларускага навуковага кабінета, які стаў адной з першых навукова-даследчых беларускіх устаноў, створаных ва ўмовах эміграцыі.*

У 1921 г. урад Чэхаславацкай Рэспублікі (ЧСР) абвясціў так званую "Рускую акцыю" (праграму па падтрымцы эмігрантаў з былой Расійскай Імперыі). Гэтая праграма была накіраваная на ўладкаванне жыцця эмігрантаў, іх інтэграцыю ў чэхаславацкае грамадства. Яна прадугледжвала таксама захаванне і развіццё нацыянальнай культуры эмігрантаў. Фінансавалася "Руская акцыя" з дзяржаўных сродкаў Чэхаславацкай Рэспублікі, у асноўным праз міністэрства замежных спраў.

У міжваенны час у Чэхаславакіі знайшлі прытулак прадстаўнікі розных народаў былой Расійскай Імперыі, у тым ліку і беларусы. Асабліва шчыльныя кантакты пражскія беларусы падтрымлівалі з украінскай дыяспарай. Адной з яскравых праяў беларуска-украінскага супрацоўніцтва стала заснаванне ў 1927 г. у Празе Беларускага навуковага кабінета пры Украінскім інстытуце грамадазнаўства (далей — БНК).

**Гістарыяграфія праблемы.** Як вядома, грунтоўнае вывучэнне гісторыі беларускай эміграцыі пачалося ў канцы 1980-х гг. Не засталася па-за ўвагай навукоўцаў і дзейнасць БНК у Празе. Праўда, дзейнасці гэтай беларускай навукова-даследчай установы прысвечаныя толькі дзве публікацыі. Першую ў 1993 г. у першым томе Энцыклапедыі гісторыі Беларусі змясціў беларускі навуковец Ю.Васілеўскі[1]. Другую, праз дзесяць гадоў, надрукавала ў "Беларускім гістарычным часопісе" ўкраінская даследчыца В.Зубко[2]. У яе грунтоўным артыкуле, падрыхтаваным на аснове матэрыялаў Цэнтральнага дзяржаўнага архіва вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны, упершыню былі разгледжаны некаторыя акалічнасці, звязаныя з арганізацыяй БНК, а таксама коратка асветлены пытанні фінансавання і дзейнасці гэтай установы. Тым не менш на сённяшні дзень гэтая тэма вывучана недастаткова.

У дадзеным артыкуле на падставе матэрыялаў архіва міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі і беларускіх віленскіх перыядычных выданняў міжваеннага часу, а таксама з улікам гістарыяграфічных напрацовак па азначанай праблеме дэталёва разглядаецца дзейнасць БНК у Празе.



***БУЧА Андрэй Іванавіч.***

*Дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Інстытута пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1985 г. у Гродна. У 2008 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2012 г. аспірантуру БДУ. У тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме: "Беларуская дыяспара ў Чэхаславакіі (1921—1938 гг.)". Займаецца вывучэннем гісторыі беларускага замежжа. Аўтар больш за 10 навуковых публікацый.*



pawet.net

**Ідэя Беларускага навуковага кабінета ў Празе і стаўленне да яе ўкраінскіх эмігрантаў на чале з Мікітам Шапавалам.** У першай палове 1920-х гг. прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі спрабавалі рэалізаваць цэлы шэраг цікавых і амбіцыйных праектаў, а менавіта намагаліся адкрыць Беларускі настаўніцкі інстытут, выдавецтва і кафедру беларусазнаўства пры Украінскім вышэйшым педагагічным інстытуце імя М.Драгаманава ў Празе. Але, шматлікія фактары не дазволілі рэалізаваць гэтыя беларускія ініцыятывы. Адной з асноўных прычын стала адсутнасць беларускіх навукоўцаў, згодных пераехаць на пастаяннае жыхарства ў Прагу і здольных займацца навукова-даследчай дзейнасцю. У такіх умовах пражскія беларусы маглі спадзявацца толькі на прадстаўнікоў мясцовай беларускай грамады.

Няўдалыя спробы па адкрыцці беларускіх устаноў у Празе ў першай палове 1920-х гг. мелі і пэўныя станоўчыя вынікі. Так, у гэты час беларусы Чэхаславакіі ўсталявалі добрыя адносіны з украінскай грамадой (колькасна значна большай за беларускую), і ў першую чаргу з вельмі ўплывовай групай на чале з Мікітам Шапавалам (з 1921 па 1925 г. узначальваў Украінскі грамадскі камітэт, які апекаваўся ўкраінскімі эмігрантамі ў ЧСР).



*Тамаш Грыб — студэнт філасофскага факультэта Карлава ўніверсітэта (Прага).*
Фота 1923 г.
Нацыянальны архіў Чэшскай Рэспублікі.

Неўзабаве ў беларускім эмігранцкім асяроддзі выспела чарговая арыгінальная ініцыятыва, што належала аднаму з найбольш харызматычных прадстаўнікоў беларускай супольнасці ў ЧСР Тамашу Грыбу[3]. Ён у 1925 г. выступіў з ідэяй заснавання пры Украінскім інстытуце грамадазнаўства ў Празе (УІГ) Беларускага навуковага кабінета[4]. Прапанова Т.Грыба была прыхільна сустрэта рэктарам УІГ М.Шапавалам, які хацеў сабраць пад дахам новай установы вядомых навукоўцаў і зрабіць яе прэстыжным даследчыцкім цэнтрам. Бясспрэчна, што на прыняцце гэтай прапановы паўплывалі добрыя таварыскія адносіны, якія склаліся паміж Т.Грыбам і М.Шапавалам, адпаведна лідарамі беларускіх і ўкраінскіх эсэраў у эміграцыі.

Украінскі інстытут грамадазнаўства, які быў створаны ў Празе 1 лістапада 1925 г. на базе Украінскага грамадскага камітэта (атрымаў ад яго памяшканне і бібліятэку), з'яўляўся прыватнай навукова-даследчай установай. Ініцыятар стварэння інстытута М.Шапавал сфармуляваў галоўную мэту новай установы як *"сацыялагічнае вывучэнне Украіны"*. Па розных прычынах (пошук фінансавання і цяжкасці з падборам навуковых кадраў) арганізацыя УІГ зацягнулася. Толькі ў верасні чэхаславацкія ўлады зацвердзілі статут інстытута[5] і, такім чынам, надалі яму афіцыйны статус.

Першапачаткова М.Шапавал прапанаваў узначаліць БНК беларускаму грамадска-палітычнаму дзеячу В.Ластоўскаму, які быў вядомы яму сваёй актыўнай і плённай навукова-даследчай дзейнасцю. Паводле фінансавай дакументацыі УІГ у Празе, В.Ластоўскі ў якасці члена-карэспандэнта УІГ у пачатку 1927 г. быў залічаны супрацоўнікам у аддзел народазнаўства і прызначаны кіраўніком БНК[6]. Але В.Ластоўскі, які ў той час пражываў у Коўне (Літва), у рэшце рэшт вырашыў вярнуцца ў Мінск, куды і перабраўся ў красавіку 1927 г.

Пасля адмовы В.Ластоўскага стала відавочна, што кіраўніка БНК неабходна выбіраць з прадстаўнікоў беларускай эміграцыі ў Празе, якія маюць неабходную гуманітарную адукацыю, грамадскі аўтарытэт і даследчыцкія здольнасці. Аднак большасць беларусаў пасля атрымання дыпломаў чэхаславацкіх ВНУ вярталіся на Бацькаўшчыну (напрыклад, перспектыўныя маладыя навукоўцы І.Дварчанін і Я.Станкевіч, якія, абараніўшы дысертацыі ў Карлавым універсітэце, вярнуліся ў Заходнюю Беларусь). Сярод беларускіх студэнтаў-гуманітарыяў, якія ў 1927 г. павінны былі скончыць чэхаславацкія ўніверсітэты, найбольш здольным быў безумоўна Т. Грыб. Таму адразу пасля заканчэння філасофскага факультэта, у лістападзе 1927 г., ён быў залічаны ў штат Інстытута і прызначаны вучоным сакратаром БНК. На выбар кандыдатуры Т.Грыба паўплываў і асабісты фактар, а менавіта яго таварыскія адносіны з украінскімі эсэрамі ў Празе.

Зразумела, што толькі добрай волі М.Шапавала і энтузіязму Т.Грыба для стварэння БНК было недастаткова. Патрэбны былі сродкі. Неабходна разумець, што ўсе пачынанні эмігрантаў фінансаваліся з бюджэту "Рускай акцыі", дзяржаўнай чэхаславацкай праграмы па падтрымцы эміграцыі з былой Расійскай Імперыі. Акурат 1927 г. стаў рубежным у развіцці гэтай праграмы. Чэхаславацкі ўрад істотна перагледзеў канцэпцыю "Рускай акцыі" і прыняў рашэнне адмовіцца ад масавага выдзялення стыпендый і студэнтам з былой Расійскай Імперыі ў ВНУ ЧСР і зрабіць акцэнт на падтрымцы навукова-даследчых ініцыятыў

эмігрантаў. У выніку разам з іншымі эмігранцкімі ўстановамі (Рускі замежны гістарычны архіў, Эканамічны кабінет прафесара Пракаповіча, Інстытут па вывучэнні Расіі, Украінская гаспадарчая акадэмія, Славянская бібліятэка) міністэрства замежных спраў ЧСР вырашыла працягнуць фінансаванне і УІГ[7].

**Канцэпцыя і статус БНК.** Перш чым перайсці да разгляду дзейнасці БНК, варта некалькі словаў сказаць пра структуру УІГ. Інстытут складаўся з чатырох аддзелаў: 1) сацыялогіі і палітыкі, 2) эканомікі і тэхнікі, 3) народазнаўства, 4) правазнаўства[8]. Кожны з аддзелаў падзяляўся на секцыі (кафедры), меў свае кабінеты і праводзіў семінары. Як аўтаномныя ўстановы пры інстытуце існавалі Украінскі нацыянальны музей-архіў і Украінскі рабочы ўніверсітэт (дзе студэнты навучаліся завочна на факультэце грамадскіх навук). Акрамя таго, пры УІГ працавала бібліятэка і ўласнае выдавецтва. Галоўнымі формамі дзейнасці інстытута былі правядзенне навуковых семінараў і пасяджэнняў, а таксама арганізацыя выступленняў членаў УІГ на пазаінстытуцкіх пляцоўках як у ЧСР, так і ў іншых краінах[9]. Супрацоўнікі УІГ падзяляліся на дзейсных членаў, членаў-карэспандэнтаў і навуковых супрацоўнікаў. З канца 1920-х гг. у афіцыйных дакументах УІГ стаў называцца Украінскім сацыялагічным інстытутам[10].

Украінскі інстытут грамадазнаўства быў аднachасова адукацыйнай і навукова-даследчай установай. Па-першае, інстытут займаўся падрыхтоўкай спецыялістаў у галіне сацыялогіі, палітыкі і эканомікі, а па-другое, з'яўляўся навукова-даследчым цэнтрам па вывучэнні сацыяльна-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця Украіны, яе суседзяў і еўрапейскіх краін увогуле[11].

Беларускі навуковы кабінет быў структурнай адзінкай аддзела народазнаўства. Гэты аддзел, які ўзначальваў Н.Грыгор'еў (пазней — Л.Білецкі), як і астатнія аддзелы, падзяляўся на секцыі, а таксама меў навукова-метадалагічны семінар і кабінеты — шаўчэнказнаўства, славяназнаўства, вывучэння Кубані і Беларусі[12]. Галоўнай задачай аддзела народазнаўства было *"вывучэнне сучасных рас і народаў свету ў іх мінулым і сучасным становішчы"*[13]. У план працы аддзела народазнаўства, сярод іншага, уваходзіла і вывучэнне гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі і пазітыўнага права Беларусі (як суседняй з Украінай краіны), а таксама даследаванне гісторыі беларускага адраджэння[14]. Гэтыя пытанні і павінен быў распрацоўваць БНК.

У навуковым перыядычным органе УІГ "Суспільство" адзначаецца, што БНК пачаў працу з 1 снежня 1927 г.[15]. Увесь склад навуковых супрацоўнікаў кабінета папаўняўся з ліку беларусаў. Вучоным сакратаром БНК прызначылі Т.Грыба. Планавалася, што з цягам часу кабінет пераўтворыцца ў самастойны беларускі навукова-даследчы інстытут[16].

Асноўныя накірункі дзейнасці БНК вызначыў Т.Грыб. У лісце да дзеяча беларускай дыяспары ў Латвіі С.Сахарава ён сфармуляваў галоўную мэту БНК, а менавіта *"навуковы досьлед і вывучэньне ўсіх асаблівасьцяў Беларускага народу, як у гістарычнай мінуўшчыне, гэтак і ў цяперашчыне"*[17].

У лютым 1928 г. на старонках віленскай газеты "Беларуская крыніца" была надрукаваная заметка, у якой асвятляліся асноўныя задачы БНК. Так, Т.Грыб са сваёй камандай у першую чаргу планавалі засяродзіцца на зборы і сістэматызацыі матэрыялаў па геаграфіі, гісторыі, літаратуры, мастацтве, гаспадарцы Беларусі, а таксама па гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Да таго ж у памяшканні БНК Т.Грыб спадзяваўся арганізаваць бібліятэку па беларусазнаўстве і беларускі музей-архіў[18].


Nr. 14. BIEŁARUSKAJA KRYNICA 3

18 **Sialanie i Rabotniki! Pracoŭnaja intelihiencyja! Mužčyny i Žančyny! Usie jak adzin 4-ha i 11-ha sakawika (marca) hałasujcie za Nr.** 18

Usie, chto za sialanska-rabotnickuju ŭładu, za ziamlu biaz wykupu, usie, chto za pakryŭdžany Biełaruski Narod—hałasujcie za №

...palitowuju staćciu z sensacyjnym ...łoŭkam: „Usie wojty z X. pawietu ...padtrymańniem špisku № 1". Jak „pracujuć" bebechaŭcy na ...ruskich wioskach, — pisać chiba ...treba, bo ŭsie dobra wiedajuć.

**Maskoŭskaja demahohija.** Kab ...anić biełaruskuju wiosku, maskoŭ... čornasociency iduć na wypierad... zapraŭdnymi radykalnymi party... U adozwach P. H. O. spaty... kličy, jakija nia majuć ničoha ...nnaha z dahetulašnimi imknień... rasiejskaj emihracyi i imknień... tych wyradkaŭ, prodki jakich ...ilisia na našych ziemlach i byli ...arusami. Ale na № 20 hetych panoŭ naša ...stwa adrazu paznałasia, bo adu... ...koniać rasiejskich ahitataraŭ won, ...prynamsia słuchać nia chočuć.

**Ks. Barodzič.** Hazety pišuć, što ...Barodzič wystawiŭ swaju kandy... ...ru prociŭ woli wilenskaha arcy... ...kupa, jaki, jak wiedama, zabara... ...ksiandzam išči kandydawać na ...łoŭ i senataraŭ. Pa apošnich wie tkach ks. Ba... ...dzič suspendawany, a jahony špisak ...dydatski skasawany. Dwajnaja, ale ...łanaja kara!

**Zahadkowaje zdareńnie.** Dawoli ...wy wypadak zdaryŭsia ŭ Wilni pry ...dańni špisku „Stronnictwa Chłop... ...go". Kali b. pasoł Adamowič znacho... ...sia z špiskam pierad pamieškań... ...m wybarnaha kamitetu, adzin pali... ...nt palićyŭ jaho prastupnikam i za... ...ŭ u kamisaryjat. Tam akazałasia, ...palicyjant pamyliŭsia i Adamo... ...wypuścili. Ale dziela taho, što ...hety čas prajšło 20 minut, Ada... ...wič prapuściŭ termin i nia mieŭ ...čymašci złažyć špisku.

**Bieznadziejnyja partyi.** 5 h. m. ...naznačany pieradwybarnyja mi... ...PPS u Jašunach, Niemančynie, ...dziškach i Kalwaryjskaj Hary, Ra...

...šanskaj wołaści. Aprača hetaha ŭ hety-ž samy dzień pawinien byŭ adbycca mitynh PPS i „Wyzwaleńnia" ŭ Sałečnikach. Ale, dziela taho, što na hetyja ŭsie mitynhi nie znajšłosia aniwodnaha słuchača, dyk jany i nie adbylisia.

## Z biełaruskaha žyćcia.

**Z Biełarusi pad Polščaj.**

**Kanfiskata „Prawasłaŭnaj Biełarusi".** Pa zahadu Kamisara Ŭradu na m. Wilniu adnačasna z kanfiskataj „Biełaruskaj Krynicy" № 12, kanfiskawana tak-ža časopiś Biełaruskaha Demokratyčnaha Abjadnańnia „Prawasłaŭnaja Biełaruś" № 4(10) za staćciu: „Blok Mienšaściaŭ i Blok supracoŭnictwa z uradam". Redaktar-wydawiec L. Hoład budzie paciahnuty d sudowaj adkaznaści.

14 studnia kanfiskawany № 15 „Сялянскай Нівы" za artykuł „Pradwybarnyja kwietki", a tak-ža za karespandencyju pad zahałoŭkam „Straląjuć", u jakoj było apisana zabojstwa ŭ w. Karyroŭščynie. Pastaŭskaha paw.

Cikawa, što hety numar u „pieršym wydańni" byŭ prapuščany, ale kanfiskawany—kali druhi raz (toj-ža numar) byŭ nadrukawany ŭ pawialičanym liku ekzemplaraŭ.

**Referat** na temu: „Biełaruski ruch paśla razhromu balšawikami Ŭsiebiełaruskaha Kanhresu ŭ Miensku" adbyŭsia ŭ niadzielu 12.II-28 h. u sali T-wa Biel. Školy (wul. św. Hanny № 2) — arhanizawany Biel. Stud. Sajuzam. Hr. Prelehient M. Kościewič, z wialikaj biezstaronnaściu i objektywizmam daŭ šyroki i padrabiazny abraz histaryčnych padziejaŭ, tak darahich dla kožnaha Biełarusa-niezaležnika, padziejaŭ, źwiazanych z dziaržaŭnym budaŭnictwam Biełarusi z časoŭ 1917—1921 h.

Prysutnych na referacie na hety raz było, na žal, zamała (na pačatku), bo dziakujučy niepunktualnamu raspačaćciu papiarednich referataŭ i wiečaryn — spaźnieńnie na hety raz jašče boĺš pawialičyłasia. Treba źwiarnuć na heta ŭwahu Sajuzu, kab staraŭsia wykać da punktualnaści.

**Z Radawaj Biełarusi.**

**Linhwistyčnaja hieohrafija Biełarusi.** Prafesar sawieckaha „Inbiełkultu" („Biełaruski Instytut Kultury") zakončyŭ niekalkihadowuju pracu nad tworam „Linhwistyčnaja hieohrafija Biełarusi". Hety cenny, nawukowy twor abymaje ŭsie dyalekty i charakterystyčnyja jazykowyja źjawyšče, jakija spatykajucca na ŭsiej Biełarusi, nia wyklučajučy abšaraŭ pad Polščaj.

Knižka budzie źmiaščać bahatyja ilustracyi i 20 kart. Drukawańnie jaje ŭžo zakončana.

— U Miensku zakončyŭsia ŭsiebiełaruski źjezd „MOPR'u". Nowy centralny kamitet składajecca z 25 siabroŭ i 7 kandydataŭ. Staršynioj wybrany Sławinski. Apošni dzień źjezdu byŭ praznačany na pryjmo ad paasobnych delehacyj składak dla palityčnych wiaźniaŭ u Polščy.

## Biełarusy ŭ Čecha-sławaččynie.

**Nowaja Biełaruskaja ŭstanowa ŭ Prazie.**

U Prazie zasnawaŭsia Biełaruski Nawukowy Kabinet, jak biełaruskaja nawukowa-daśledčaja ŭstanowa, dačasna pry Ŭkrainskim Instytucie Hramadaznaŭstwa. Maje jon na mecie ŭ budučynie adasobnicca i zusim usamastojnicca, dy prystupiŭ da swaje čynnaści z listapada miesiaca 1927 hodu.

U bližejšym časie Biełaruski Nawukowy Kabinet stawić sabie hetkija zadańni:

1. Žbirańnie i systematyzawańnie materyjałaŭ ab Biełarusi ŭ halinie hieohrafii, historyi, literatury i mastactwa, haspadarki dy inš., a taksama materyjałaŭ da historyi biełaruskaha wyzwalna-adradženskaha ruchu.

2. Arhanizacyja biblijateki biełarusaznaŭstwa i biełaruskaha muzeju-archiwu.

3. Nawukowy dośled i wyŭčańnie asabliwaściaŭ Biełarusi, jak hieohrafičnaj, kulturna-histaryčnaj, sacyjalna-ekanamičnaj i linhwistyčnaj adzinki dy jaje miejsca ŭ systemie ŭzajema-adnosin narodaŭ Uschodniaje Eŭropy.

4. Daśledźwańnie pryrodnych bahaćciaŭ Biełarusi, sučasnaha haspadarča-ekanamičnaha, kulturnaha i palityčnaha stanu biełaruskaha narodu, tendencyj i perspektywaŭ jahonaha raźwićcia, a taksama wyŭčańnie praŭnych normaŭ, jakimi faktyčna rehulujecca haspadarčaje, kulturnaje dy palityčnaje žyćcio biełaruskaha narodu ŭ abstawinach roznych ražymaŭ.

5. Wyświatleńnie ahulnych padwalin samastojnaha istnawańnia Biełarusi dy ŭklučańnie jaje ŭ suświetnuju systemu kulturnaj, haspadarčaj i palityčnaj mižnarodnaj uzajemačynnaści dy zbližańnia.

6 Dziela ździejśnieńnia hetych zadańniaŭ Biełaruski Nawukowy Kabinet, u asobie jaho sekretara-kiraŭnička, zaprašaje adpawiedny lik stałych supracoŭnikaŭ i supracoŭnikaŭ-karespandentaŭ, wypiswaje biełaruskija peryjadyčnyja dy inšyja wydańni, ładzić dakłady, padrychtoŭwaje da druku materyjały, ładzić ich wydańni, kab u hetki sposab — šlacham wydańnia adumysnaha zborniku, a tak sama brašur dy inš. pracaŭ B.N.K.—znajomić šyrejšyja koły biełaruskaha i čužoha hramadzianstwa ab zapraŭdnym stanie Biełarusi.

Adras: Šerikowa 4-III, Praha III (Tchécoslovaque).

**HRAMADZIANIE!**
**Hałasujcie za № 18.**

*Старонка з газеты "Беларуская крыніца", на якой змешчана заметка пра дзейнасць БНК.*
Вільня, 1928 г.

Тамаш Грыб меркаваў, што галоўны акцэнт БНК павінен зрабіць на навуковай дзейнасці. Больш за тое, кіраўнік БНК акрэсліў магчымае кола праблем і тэм для вывучэння. На думку Т.Грыба, супрацоўнікі кабінета мусілі засяродзіцца на даследаванні асаблівасцяў Беларусі як геаграфічнай, культурна-гістарычнай, сацыяльна-эканамічнай, лінгвістычнай адзінкі і яе месца ў сістэме ўзаемаадносін народаў Усходняй Еўропы, а таксама на вывучэнні прыродных багаццяў Беларусі, гаспадарча-эканамічнага, культурнага і палітычнага становішча беларускага народа, тэндэнцый і перспектыў яго развіцця, аналізе заканадаўчых норм, якімі рэгулявалася гаспадарчае, культурнае і палітычнае жыццё беларускага народа ва ўмовах розных палітычных рэжымаў[19].

З вышэйадзначанага можна зрабіць выснову, што Т.Грыб, як вучоны сакратар БНК, будаваў даволі амбіцыйныя планы і намеціў тры асноўныя накірункі дзейнасці новай установы: 1) навуковае вывучэнне Беларусі і беларускага народу, 2) арганізацыя бібліятэкі па беларусазнаўстве, 3) стварэнне музея-архіва.

**Змест дзейнасці БНК.** Як ужо адзначалася вышэй, штат БНК фармаваўся выключна з беларусаў. Акрамя Т.Грыба, які сам выконваў вялізны аб'ём работы, у дзейнасці кабінета прымалі ўдзел Сяргей Бусел[20], Мікола Ільяшэвіч[21], Ігнат Сланеўскі[22], Мікола Чарнецкі[23]. Адказваў за падбор супрацоўнікаў для БНК Т.Грыб. Пры разглядзе кандыдатур вучоны сакратар кабінета ўлічваў як асабістае знаёмства з прэтэндэнтамі, так і іх прафесійныя якасці. Так, С.Бусел і М.Чарнецкі былі партыйнымі сябрамі і палітычнымі аднадумцамі Т.Грыба. Усе трое ўваходзілі ў пражскае бюро ЦК БПС-Р. Т.Грыб ім давяраў, добра іх ведаў. Гэта, напэўна, і прадвызначыла яго выбар. Кіраўнік БНК быў добра знаёмы з М.Ільяшэвічам і І.Сланеўскім. Ён мог запэўніцца ў прафесіяналізме апошніх па супольнай працы у Крывіцкім (Беларускім) культурным таварыстве імя Францыска Скарыны ў Празе, што дзейнічала з 1925 г. Усе супрацоўнікі БНК, акрамя інжынера С.Бусла, былі гуманітарыямі, што адпавядала вызначаным накірункам дзейнасці новай беларускай установы. З 1928 г. у якасці "супрацоўніка-карэспандэнта" да БНК далучыўся В. Шышкоў[24], які стала пражываў у Вільні.

Беларускі навуковы кабінет фінансаваўся з фондаў МЗС ЧСР. Месячны бюджэт кабінета складаў 900 крон, з якіх 600 выплачваліся вучонаму сакратару БНК, а 300 расходаваліся на аплату працы супрацоўнікаў БНК (атрымлівалі грошы за выкананыя навуковыя тэмы), арганізацыю архіва, набыццё літаратуры, паштовыя і канцылярскія выдаткі і інш.[25]. Але ў тых выпадках, калі запланаваныя выдаткі (напрыклад, на набыццё кніг і камплектаў часопісаў) перавышалі вызначаны бюджэт, БНК атрымліваў дадатковыя сродкі з касы УІГ. Трэба сказаць, што так здаралася даволі часта.

Наяўныя крыніцы дазваляюць скласці цэласнае ўяўленне пра змест дзейнасці БНК з лістапада 1927 г. па ліпень 1929 г. За першы год дзейнасці (да восені 1928 г.) супрацоўнікі БНК выканалі вялікі аб'ём працы. Пры кабінеце адкрылася бібліятэка беларусазнаўства (сабрана больш за 200 кніг). Пад кіраўніцтвам М.Чарнецкага быў створаны архіў дакументаў (якія дакументы былі сабраныя для архіва, высветліць не ўдалося) і беларускіх перыядычных выданняў перыяду 1918—1928 гг. Калектыў супрацоўнікаў БНК падрыхтаваў да друку "Запіскі Беларускага кабінету пры Украінскім інстытуце грамадазнаўства". У гэтае выданне ўвайшлі даследаванні Т.Грыба ("Сацыялагічная тэорыя нацыі", "Грамадская структура Беларусі"; "Ідэалагічныя плыні ў беларускім вызваленчым руху"), М.Чарнецкага ("Узаемаадносіны ВКЛ з Польскай Каронай у пачатку 17 ст."), М.Ільяшэвіча ("Антропагеаграфія Беларусі"), І.Сланеўскага ("Беларускі народны элемент у польскай літаратуры"), С.Бусла ("Гаспадарчае і культурнае становішча Беларусі"). Аднак "Запіскі" так і не былі надрукаваныя з-за адсутнасці фінансавання. Акрамя таго, у азначаны перыяд Т.Грыб выступаў у кабінеце з дакладамі на тэмы, прысвечаныя навуковаму вывучэнню Беларусі[26].

З лістапада 1928 г. па ліпень 1929 г. супрацоўнікі БНК выканалі наступныя навуковыя тэмы: В.Шышкоў ("Зямельныя адносіны ў Заходняй Беларусі"), М.Чарнецкі ("Польска-маскоўскія войны на пачатку XVII ст."), І.Сланеўскі ("Беларускі народны элемент у творчасці Э.Ажэшкі"), М.Ільяшэвіч ("Гістарычна-геаграфічныя падваліны дзяржаўнай незалежнасці Беларусі"), С.Бусел ("Пра павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых раслін у Беларусі"), Т.Грыб ("Гаспадарчае і культурнае становішча Беларусі ў апошняе 10-годдзе"; "Пра метад навуковага даследавання гісторыі Беларусі"; "Праблема свабоды волі з сацыялагічнага погляду"; "Беларуская справа"; "Пра метад навуковага даследавання і вывучэння беларускай літаратуры")[27]. Акрамя таго, у справаздачы за снежань 1928 г. Т.Грыб адзначыў, што С.Бусел падрыхтаваў гаспадарча-эканамічную тэрміналогію на беларускай мове, а М.Чарнецкі ўпарадкаваў матэрыялы архіва пры БНК і *"перапісаў на машынцы матэрыялы БНК"*[28].

Шырыня і глыбіня праблем, якія даследавалі супрацоўнікі БНК, уражвае. Неабходна адзначыць, што праблематыка даследаванняў супрацоўнікаў БНК пераважна адпавядала тэмам іх дысертацый, якія яны рыхтавалі падчас навучання ў чэхаславацкіх ВНУ. Але ў цэнтры навуковай увагі Т.Грыба і яго калег знаходзіліся не толькі цікавыя ім самім пытанні, але ў першую чаргу актуальныя для беларускай навукі тэмы, такія як беларускі нацыянальны рух, станаўленне беларускай дзяржаўнасці, метадалогія вывучэння гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры, польска-беларускія літаратурныя сувязі і інш. Дадатковую навуковую вартасць даследаванням БНК надавала грунтоўная тэарэтычная падрыхтоўка іх аўтараў, якія ў працэсе свайго навучання ў пражскіх вышэйшых школах знаёміліся з найлепшымі дасягненнямі тагачаснай еўрапейскай навукі.

Акрамя таго, супрацоўнікі БНК спрабавалі перанесці замежны вопыт на айчынную навуковую глебу.



БЕЛАРУСКІ НАВУКОВЫ КАБІНЭТ
Bělorusky vědecký kabinet.

Šeřikova. 4/III.
PRAHA III. (Tchécoslovaqie)

Прага. 8 лютага 1928

№ 12/28 9.II.28

Вельміпаважаныя Грамадзяне,

Перасылаючы пры гэтым да Вашага ведама адкрыты ліст „Да ўсіх беларускіх навуковых установаў, культурна-прасьветных арганізацый і ґазэтаў як рэдакцый часопісаў, выдавецкіх таварыстваў, як за межамі, гэтак і ў краі", Беларускі Навуковы Кабінэт упэўнены ў Вашым зычлівым адносіньні да справы навуковага досьледу і вывучаньня Беларусі як спадзяецца, што Вы адгукнецеся на ягоны заклік спрыязьлівым словам як чынам.

З поўнай пашанаю

Сэкрэтар-кіраўнічы.

*Ліст кіраўніка Беларускага навуковага кабінета Тамаша Грыба да беларускіх навуковых устаноў, культурна-асветніцкіх арганізацый, часопісаў, выдавецтваў з заклікам да супрацоўніцтва.*
Прага, 8 лютага 1928 г.
Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў.

Так, Т.Грыб прымяняў сацыялагічныя метады і тэорыі пры вывучэнні беларускага грамадства, даследаваў пытанні нацыябудаўніцтва. М.Ільяшэвіч сур'ёзна займаўся антрапалагічным вывучэннем Беларусі.

Цікава, што зазнаў на сабе БНК і ўплыў крывіцкай тэорыі В.Ластоўскага, якая ў сярэдзіне 1920-х гг. была даволі папулярнай сярод пражскіх беларусаў. Так, у справаздачы пра дзейнасць БНК за лістапад 1928 г. — ліпень 1929 г. поруч з назвай "Беларусь" ужывалася і назва "Крывія". Але ў пазнейшай дакументацыі БНК назва "Крывія" і вытворныя ад яе больш не сустракаліся.

Інфармацыя пра дзейнасць кабінета ў перыяд з ліпеня 1929 г. па ліпень 1930 г. захавалася фрагментарна. Вядома толькі, што ў верасні 1929 г. супрацоўнікі БНК падрыхтавалі наступныя працы: "Бібліяграфія да гісторыі беларускага народа" (М.Чарнецкі), "Тыпы сялянскіх гаспадарак на Беларусі" (С.Бусел)[29]. У апошні месяц 1929 г. Т.Грыб адправіў адзін ліст у Вільню, БНК набываў кнігі і часопісы, перасылаў кнігі М.Чарнецкаму ў в. Малыя Азяраны (цяпер Польшча)[30].

Нягледзячы на тое, што "Запіскі Беларускага кабінету пры Украінскім інстытуце грамадазнаўства" не былі выдадзеныя, навуковыя напрацоўкі супрацоўнікаў БНК у большасці сваёй сталі даступнымі шырокаму колу чытачоў. Так, Т.Грыб апублікаваў частку сваіх артыкулаў, напісаных падчас працы у БНК, у беларускіх пражскіх выданнях ("Бюлетэні заграгічнай групы беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў", часопісе "Іскры Скарыны").

Разумеючы БНК як доўгатэрміновы навукова-даследчы праект, Т.Грыб спрабаваў наладзіць супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі ў Польшчы (Вільня), БССР (Мінск), Латвіі (Рыга, Дзвінск), ЗША (Чыкага). Вывучаная намі справаздачная дакументацыя кабінета дазваляе скласці спіс арганізацый, з якімі Т.Грыб вёў перапіску. Сярод адрасатаў БНК былі Інстытут беларускай культуры (пасля — Беларуская акадэмія навук), Галоўнавука пры Народным камісарыяце асветы БССР, Беларуская кніжная палата, рэдакцыя часопіса "Полымя", Беларускі музей у Вільні, Беларускае навуковае таварыства ў Вільні, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, рэдакцыя часопіса "Сялянская ніва" (Вільня), Беларускае краязнаўчае таварыства ў Латвіі, рэдакцыя газеты "Беларускі голас" (Рыга), рэдакцыя газеты "Беларуская Трыбуна" (Чыкага) і інш. Найбольш распаўсюджанымі тэмамі ліставання былі набыццё літаратуры для бібліятэкі БНК, змяшчэнне інфармацыі пра кабінет у друку, кансультацыі па навуковых пытаннях, прапанова па супрацоўніцтве.

Большую частку бібліятэчных фондаў БНК складалі віленскія беларускія выданні. У іх дастаўцы супрацоўнікам кабінета дапамагалі беларускія студэнты, якія набывалі патрэбныя кнігі і часопісы ў Вільні падчас вакацыяў. Па прыездзе ў Прагу яны здавалі кнігі ў БНК і атрымлівалі ад Т.Грыба грашовую кампенсацыю. На камплектаванне бібліятэкі расходавалася значная частка бюджэту БНК[31].

У другой палове 1929 г. тры супрацоўнікі БНК (С.Бусел, М.Ільяшэвіч і М.Чарнецкі) выехалі з Прагі на радзіму. Вярнуўшыся ў Заходнюю Беларусь, яны працягвалі супрацоўніцтва з БНК, але ўжо не так актыўна. Дзейнасць БНК паступова затухала. Фактыч-

на адзіным дзейным супрацоўнікам кабінета заставаўся Т.Грыб.

У ліпені 1930 г. міністэрства замежных спраў Чэхаславакіі спыніла фінансаванне Украінскага інстытута грамадазнаўства. Спыненне міністэрскай дапамогі прывяло да значнага скарачэння навуковай працы інстытута: была звольненая значная частка яго супрацоўнікаў, цалкам спыненая дзейнасць музея-архіва і рабочага ўніверсітэта, зменшылася плошча памяшканняў, дзе размяшчаўся УІГ[32]. У выніку з-за недахопу сродкаў кіраўніцтва інстытута закрыла і БНК.

У такіх умовах звышактуальнай стала задача пошуку новага памяшкання пад фонды БНК. Лёс яго калекцый быў вырашаны наступным чынам. Бібліятэку кабінета перадалі ў Славянскую бібліятэку ў Празе і далучылі да яе беларускага аддзела. Архіўныя матэрыялы БНК папоўнілі фонды Беларускага замежнага архіва ў Празе, які быў заснаваны ў 1928 г. беларускім грамадскім і палітычным дзеячам М.Вяршыніным. Тамаш Грыб перайшоў на працу ў Славянскую бібліятэку, дзе працягваў займацца складаннем бібліяграфіі па ўсіх галінах беларусазнаўства і ўпарадкаваннем матэрыялаў беларускага аддзела гэтай бібліятэкі[33].

Такім чынам, беларускі навуковы кабінет у Празе стаў адной з першых у гісторыі беларускага замежжа навукова-даследчых устаноў. Душой і галоўным рухавіком БНК быў Т.Грыб. Менавіта дзякуючы ягонай


Распіска.
Атрымана ад Беларускага Навуковага Кабінэту дзьвесьце (200 кč) кароналаў за працу па складаньню Бібліографіі да гісторыі беларускага народу.
9/IX 1929. Др. М. Чарнецкі.
Выплаціў Др Тамаш Грыб

*Распіска Міколы Чарнецкага аб атрыманні ім грошай ад Беларускага навуковага кабінета за зробленую працу.*
Прага, 9 верасня 1929 г.
Архіў міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі.

самаахвярнай працы кабінет здзейсніўся як навукова-даследчы праект.

За амаль тры гады супрацоўнікі БНК правялі вялікую работу. Па-першае, на пастаяннай аснове было


Распіска
Атрымана мной з Касы Украінскага Сацыялёгічнага Інстытуту на паштовыя выдаткі:
1. ліст Беларускай Кнігарні ў Вільні (5.IX.1929) ... 2 кč.
2. ліст Беларускаму навуковаму т-ву ў Вільні (10.IX.29) .. 2 ..
3. ліст Беларускаму музэю ў Вільні (10.IX.1929) ... 2 "
4. Ліст Беларускай [illegible] у Менску (14.IX.29).. 2.50.
5. Ліст [illegible] ў Менску (15.IX.1929) ...... 2.50.
6. ліст Беларускаму [illegible] ў [illegible] (20.IX.29).. 2.50.
Разам .... 13.50.
Трынаццаць кč. і 50 гал.
Др Тамаш Грыб
31.IX.1929 году
м. Прага.
66

*Распіска Тамаша Грыба аб атрыманні ім грошай з касы Украінскага сацыялагічнага інстытута на паштовыя выдаткі.*
Прага, 31 верасня 1929 г.
Архіў міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі.

наладжана навуковае вывучэнне Беларусі, яе гісторыі, эканоміκі, геграфіі і інш. Але аднаго энтузіязму і імпэту маладых супрацоўнікаў кабінета, без інстытуцыянальнай базы і сталага фінансавання, было недастаткова. Прызнаючы вартасць і значнасць даследаванняў супрацоўнікаў БНК, трэба ўсё ж адзначыць, што гэта былі першыя крокі пачынаючых даследчыкаў, якія сваёй дзейнасцю заклалі традыцыю эміграцыйнага беларусазнаўства і сфарміравалі праграму дзеянняў на будучыню. Па-другое, супрацоўнікі БНК заснавалі ўнікальную бібліятэку па беларусазнаўстве, фонды якой пазней склалі аснову беларускага аддзела Славянскай бібліятэкі ў Празе. Па-трэцяе, у сценах БНК выспела ідэя збірання архіўнай спадчыны беларускага замежжа, якая была рэалізаваная ў межах Беларускага замежнага архіва ў Празе.

---

[1] Васілеўскі Ю. Беларускі навуковы кабінет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 1. Мн., 1993. С. 438.

[2] Зубко В. "Curriculum vitae" Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба // Беларускі гістарычны часопіс. 2003, № 3. С. 62—71.

[3] Грыб Тамаш (1895—1938) — беларускі палітычны, грамадскі і культурны дзеяч. У Празе — з восені 1922 г. Скончыў філасофскі факультэт Карлава ўніверсітэта ў 1927 г. Абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Праблемы фарміравання народа і нацыі". Прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі. Быў ініцыятарам стварэння замежнага бюро Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), Аб'яднання беларускага паступовага студэнцтва, суполкі "Вольная грамада". Акрамя гэтага ўваходзіў у кіраўніцтва Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый, Беларускага (Крывіцкага) культурнага таварыства імя Францыска Скарыны. Быў адным з заснавальнікаў міжнароднай сацыялістычнай арганізацыі — Сацыялістычная Ліга Новага Усходу.

[4] Зубко В. "Curriculum vitae" Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба. С. 63.

[5] Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції 1919—1939 (матеріали, збірані С.Наріжним до частини другої). Ч. 2. Киів, 1999. С. 23.

[6] Зубко В. "Curriculum vitae" Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба. С. 66.

[7] Сладек З. Русская эмиграция в Чехословакии: развитие "Русской акции" // Славяноведение. 1993, № 4. С. 28—38.

[8] У трэці год існавання УІГ аддзелы эканомікі і тэхнікі, а таксама правазнаўства былі далучаныя да аддзела сацыялогіі і палітыкі як секцыі гэтага аддзела.

[9] Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції 1919—1939 (матеріали, збірані С.Наріжним до частини другої). Ч. 2. С. 23-24.

[10] Ямкова О. "Празький період" життя та праці Томаша Гриба // Пам'ятки: археогрофічний щорічник. Т. 6. Київ, 2006. С. 110.

[11] Зубко В. "Curriculum vitae" Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба. С. 63.

[12] Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції 1919—1939 (матеріали, збірані С.Наріжним до частини другої). Ч. 2. С. 23.

[13] Хроніка українського інституту громадознавства в Празі. 1925. № 1-2. С. 5.

[14] Там жа. С. 7.

[15] Па іншых звестках, БНК быў заснаваны 27.10.1927 г., а з 1.11.1927 г. яго супрацоўнікі прыступілі да працы (Звіт з діяльности Інституту і його установ (Квітень 1926 — Листопад 1928). Прага, 1928. С. 28).

[16] Хроніка українського інституту громадознавства в Празі // Суспільство. 1927, № 5-6. С. 157.

[17] Сахараў С. Др. Тамаш Грыб у сьвятле сваіх пісьмаў // Калосьсе. 1938. Кн. 1. С. 54-55.

[18] Nowaja Bielaruskaja ustanowa u Prazie // Bielaruskaja Krynica. 1928. № 14. 16 lut. S. 3.

[19] Там жа.

[20] Бусел Сяргей (1901 — пасля 1939) — беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У Празе — з 1922 г. Вучыўся ва Украінскай гаспадарчай акадэміі ў Падэбрадах. Адкуль у 1923 г. пераведзены на аграномічны факультэт Пражскай палітэхнікі. У 1929 г., пасля атрымання дыплому інжынера, вярнуўся ў Заходнюю Беларусь.

[21] Ільяшэвіч Мікола (1903—1934) — беларускі грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, педагог. У Празе — з 1923 г. У 1928 г. скончыў філасофскі факультэт Карлава ўніверсітэта са ступенню доктара філасофіі, абараніўшы дысэртацыю на тэму "Беларусь (Белая Русь) як самабытная адзінка з антропагеаграфічнага гледзішча. (З улікам гісторыі і этнаграфіі)". У 1929 г. вярнуўся ў Заходнюю Беларусь.

[22] Сланеўскі Ігнат (1900—1970) — беларускі грамадскі дзеяч, педагог. У Празе — з 1923 г. Вучыўся на філасофскім факультэце Карлава ўніверсітэта. Працаваў над дысертацыяй на тэму "Беларускія народныя матывы ў творчасці Э.Ажэшкі" (не абараніў). У канцы 1920-х гг. вярнуўся ў Заходнюю Беларусь.

[23] Чарнецкі Мікола (1899—1944) — беларускі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, педагог. У Празе — з 1921 г. Вучыўся на ўкраінскіх матуральных курсах у Юзэфове. Скончыў філасофскі факультэт Карлава ўніверсітэта са ступенню доктара філасофіі, абараніўшы дысертацыю на тэму "Польска-маскоўская вайна 1632—1634 гг.". У 1929 г. вярнуўся ў Заходнюю Беларусь.

[24] Біяграфічныя звесткі пра яго не выяўленыя.

[25] Зубко В. "Curriculum vitae" Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба. С. 70.

[26] Звіт з діяльности Інституту і його установ (Квітень 1926 — Листопад 1928). С. 28.

[27] Звіт з діяльности Інституту і його установ (Листопад 1928 — Липень 1929). Прага, 1929. С. 22.

[28] Archiv ministerstva zahraničních věcí České Republiky (AMZV ČR). II Sekce politická, 1918–1939. Karton 244. Osvěta — Ustavy osvětove a vědecke. L. 87b.

[29] Там жа. L. 63.

[30] Там жа. L. 98.

[31] Там жа. L. 98, 102, 109.

[32] Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами. Ч. 1. Прага, 1942. С. 26.

[33] Сахараў С.Др. Тамаш Грыб у сьвятле сваіх пісьмаў. С. 56.

---

*У дадатку да артыкула змешчаны дакументы аб дзейнасці БНК, знойдзеныя намі ў архіве міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі. Пры публікацыі дакументаў захаваны мова арыгінала, асаблівасці арфаграфіі і пунктуацыі.*

*Дадатак*

**№ 1**

Справаздача № 12.

Дырэктара-кіраўніка Беларускага Навуковага Кабінэту (пры Украінскім Соцялёгічным Інстытуце) у Празе.

за верасень 1929 году.

Зробленыя выдаткі:

1. Выплачана Д-ру М.Чарнэцкаму, супрацоўніку Б.Н.К., за выкананую працу: "Бібліографія да гісторыі беларускага народу"................................200 kč.

2. Выплачана Інж. С.Буслу, супрацоўніку Б.Н.К., за выкананую працу: "Тыпы сялянскіх гаспадарак на Беларусі".....................................................200 kč.

3. Паштовыя выдаткі.................................13.50

Разам.............413.50

Азначаную суму: Чатырыста трынаццаць kč і 50 hal. прашу залічыць на пакрыцьцё атрыманага авансу

[подпіс Т. Грыб]

30.IX.1929 году

м. Прага

Прылогі да справаздачы: 3 расьпіскі.

*AMZV. II Sekce politická, 1918—1939. Karton 244. Osvěta — Ustavy osvětove a vědecke. L. 63.*

**№ 2**

Распіска

Атрымана мною ад Беларускага Навуковага Кабінэту ў Празе за прададзеныя ў бібліатэку Кабінэта камплекты часопісаў за 1925, 1926, 1927, 1928 г.:

1. "Жыцьцё Беларуса" за 1925. 15kč

2. "Беларуская Ніва" за 1925–1926 г. 25–

3. Аднаднеўкі: "За праўду", "На прадвесьні", "Наш кліч" за 1926 г. 15 –

4. Часопісі за 1927 г.: "Наш Голас", "Наша Воля", "Наша Праўда", "Наша Праца", "Праца", "Права Працы" і аднаднеўка "Наш Вотклік" 50 –

5. Часопісі за 1928 г.: "Думка Працы", "Сіла Працы", "Воля Працы", "Голас Працы", "Зара Працы", "Сьцяг Працы", "Доля Працы", "Рэха Працы", "Слова Працы", "За Працу", і аднаднеўка "Красавік" 50 –

Разам 155 kč.

Сто пяцьдзесят пяць карон чэскіх атрымаў

[подпіс І.Сланеўскі]

15 сьнежня 1929.

м. Прага

Азначаную суму грош[ы] — сто пяцьдзесят пяць kč. — выплаціў і камплекты часопісаў прыняў

[подпіс Т. Грыб]

*AMZV. II Sekce politická, 1918—1939. Karton 244. Osvěta — Ustavy osvětove a vědecke. L. 103.*

**№ 3**

Распіска

Атрымана мною ад Беларускага Навуковага Кабінэту у Празе за праданыя ў бібліатэку кабінэта кнігі:

1. Сацыялістычны рух на Беларусі у праклямацыях 1905 г. 40 kč.

2. И.Лаппо: Западная Россия и ее соединеніе с Польшею 20 –

3. М.Моравскій: Экономическое положеніе Литвы и Белорусіи 15 –

4. М.Моравскій: Государственное единство и независимость Литвы 20 –

5. Dr. Ignac Weinfeld: Tablice statystyczne Polski 20 –

6. Edw. Maliszewski: Przewodnik po gub. Wilenskej 10 –

7. Е.Ф.Романов: Быт белоруса 60 –

8. А.Н.Ляўданскі: 1) Раскопкі і археолёгічные разведкі ў Барысаўскім павеце; 2) Сьляды нэалітычнай стаянкі і пазнейшае Культуры каля м. Новы Быхаў 25 –

9. М.Шчакатіхін: Васіль Вашчэнка — магілеўскі гравёр канца XVII і XVIII ст. 15 –

10. М.Пятуховіч: Апавяданьня "У Палескай глушы" як новы этап беларускай мастацкай прозы 10 –

11. Prof. Z.Ludkiewicz: Wytyczne reformy rolnej na Bialej Rusi 20 –

12. Proces 490 de la Ghromade Bielorussie a Wilna 15 –

13. А. Смоліч: Арганізацыя сялянскай гаспадаркі ў цэнтральнай Беларусі 35 –

14. С.Ждановіч і А.Ярашук: Характарыстыка сельскай гаспадаркі Беларусі 20 –

15. Фр.Багушэвіч: Смык беларускі 10 –

16. Матэрыялы па лясной дасл. справе Б.С.С.Р. 35 –

Трыста дзевецдзесят пяць kč атрымаў

15.12.1929 году

[подпіс С.Бусел]

*AMZV. II Sekce politická, 1918—1939. Karton 244. Osvěta – Ustavy osvětove a vědecke. L. 102.*